Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

15 ЛІПЕНЯ 2020 г.

СЕРАДА

№ 135 (29249)

МЕТЭАЗАЛЕЖНАСЦЬ: РЭАЛЬНАСЦЬ АБО ФАНТАЗІЯ? 6

КУНШТАТ — ЗНІКЛЫ ГОРАД МАЙСТРОЎ 8

Выбары-2020

ГОНКУ ПРАЦЯГНУЦЬ ПЯЦЁРА

Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала кандыдатамі ў прэзідэнты Андрэя Дзмітрыева, Ганну Канапацкую, Аляксандра Лукашэнку, Святлану Ціханоўскую і Сяргея Чэрачня. Менавіта ў такім парадку прозвішчы ўдзельнікаў сёлетняй выбарчай кампаніі будуць размешчаныя ў бюлетэнях для галасавання.

ЦВК адмовіла ў рэгістрацыі кандыдату ў прэзідэнты Віктару Бабарыку на падставе парушэння патрабавання Выбарчага кодэкса адносна ўдзелу замежных арганізацый і грамадзян у выбарчай кампаніі. Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына спаслалася на звесткі Камітэта дзяржаўнага кантролю аб фактах выкарыстання Віктарам Бабарыкам замежнай фінансавай дапамогі ў інтарэсах выбарчай кампаніі. Акрамя таго, нагодай для адмовы магла стаць неадпаведнасць пададзенай дэкларацыі аб даходах прэтэндэнта фактычным даходам. На пасяджэнні ЦВК прагучала інфармацыя з матэрыялаў расследавання, якое адбываецца ў гэты час у адносінах да Віктара Бабарыкі.

Неадпаведнасць гадавога даходу жонкі прэтэндэнта, які ўказаны ў дэкларацыі, фактычнаму, а таксама недастатковая колькасць верыфікаваных тэрытарыяльнымі камісіямі подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатам у прэзідэнты сталі нагодай для адмовы ў рэгістрацыі Валерыю Цапкалу.

Алег Гайдукевіч, Юрый Ганцэвіч, Юрый Губарэвіч, Наталля Кісель, Вольга Кавалькова, Мікалай Казлоў, Уладзімір Няпомняшчых і Аляксандр Таболіч, ініцыятыўныя групы якіх раней таксама былі зарэгістраваныя, не падавалі дакументаў на рэгістрацыю іх кандыдатамі.

Ва ўрадзе

Не дзяліць, а быць разам

Прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі правялі перагаворы ў Маскве аб супрацоўніцтве ў энергетычнай сферы

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА адзначыў асаблівы характар беларуска-расійскіх адносін. «Прамыя кантакты і нацэленая на канкрэтныя дасягненні работа на ўрадавым узроўні маюць у цяперашніх умовах прынцыпова важнае значэнне, — сказаў ён. — Новы склад урада захоўвае нацэленасць на дасягненне ўзаемавыгадных рашэнняў па ўсіх актуальных пытаннях. Разлічваем, што саюзніцкі характар нашых адносін дазволіць знаходзіць кампрамісы па ўсіх адчувальных для абодвух бакоў пытаннях. Нават самая прагматычная пазіцыя, на наш погляд, павінна ўлічваць не толькі імгненныя або кароткатэрміновыя камерцыйныя інтарэсы, але і ўвесь комплекс адносін, які складаецца гадамі і дзесяцігоддзямі».

Ва ўмовах пандэміі, крызісных з'яў у эканоміках усяго свету, на думку кіраўніка беларускага ўрада, «трэба не дзяліць, а быць разам і ад гэтага быць мацнейшымі».

Раман Галоўчанка запэўніў, што, нягледзячы на падзенне тавараабароту паміж краінамі, Расійская Федэрацыя застаецца ключавым гандлёвым партнёрам Беларусі. «Мы па тавараабароце, па нашых разліках, на 22 % за мінулы перыяд знізіліся. Сапраўды, расійскі экспарт больш пацярпеў, чым беларускі, гэта звязана ў асноўным з вуглевадароднай тэматыкай. Але, вядома, аб'ектыўная прычына гэтаму — не пагаршэнне адносін паміж краінамі, не нейкія сістэмныя праблемы. Гэта знешнеэканамічная кан'юнктура і шэраг іншых крызісаў, якія наклаліся», — пракаментаваў ён.

«Але ўсё ж нельга не адзначыць і не прызнаць той факт, што не менш адчувальным момантам з'яўляецца ўзаемна страчаная выгада ад захаваных бар'ераў, выключэнняў і абмежаванняў па доступе на ўнутраны рынкі, — дадаў беларускі прэм'ер. — Мы з гэтым змагаемся і на двухбаковай аснове, і ў рамках еўразійскай інтэграцыі. Тым не менш такія факты працягваюць заставацца».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Японская вярба красуе пад Гомелем

Фота БелТА.

Гэтыя прыгожыя кусты з далёкага азіяцкага вострава па-японску называюцца «хакура». Яны нядрэнна сябе адчуваюць у Гомельскім доследным лясгасе, які па выніках работы летась прызнаны найлепшым у краіне. Начальніку лесагадавальніка Лініі ГУЛЯЕВАЙ ёсць чым ганарыцца і на што дзівіцца.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ГЛАЗ, начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — прэс-сакратар МЗС:

«Беларускі народ сам зробіць свой выбар без падказкі «добразычліўцаў» звонку. Ні Еўрасаюз, ні хто-небудзь іншы з боку не будзе вызначаць ход выбарчага працэсу ў нашай краіне. Мы адкрытыя (і даказваем гэта на практыцы) для раўнапраўнага і ўзаемапаважлівага дыялогу з нашымі еўрапейскімі партнёрамі. І такі дыялог ідзе, прытым з пазітыўнымі вынікамі для кожнага боку, з прамым эфектам для грамадзян Беларусі і ЕС. Але гэта не значыць, што мы пацерпім ціск на нашы судовую, праваахоўную і выбарчую сістэмы, тым больш пагрозы, адкуль бы яны ні зыходзілі».

Запрашальнік

ЛЕТА. ВІЦЕБСК. ФЕСТЫВАЛЬ

Ужо 29-ы раз прагучаць у ліпені прывітальныя акорды міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» — сёлета ўпершыню выключна пад адкрытым небам. З улікам складанай эпідэміялагічнай сітуацыі і закрытасці многіх граніц аргкамітэт вымушаны быў істотна перагледзець і скараціць праграму, тым не менш пакінуўшы ў шчыльным музычным графіку самыя цікавыя, яскравыя і любімыя гледачамі падзеі. Пра апошнія змены ў афішы і асаблівасці сёлетняга форуму напярэдадні яго адкрыцця даведаліся карэспандэнты «Звязды». СТАР. 3

Фота БелТА.

Пачалася акрэдытацыя ўдзельнікаў і гасцей XXIX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». На здымку: удзельніца фестывалю Дзіяна АМЕЛЬЧАНКА.

Па палічках

ЧЫМ «ПАДКАРМІЦЬ» ІМУНІТЭТ?

Моц нашага «шчыта ад вірусаў» напрамую залежыць ад таго, што знаходзіцца ў нас на талерцы

— Не існуе ніводнага прадукта харчавання, здольнага знішчыць вірусную інфекцыю: ні «модны» COVID-19, ні банальнае ВРЗ, — кажа намеснік генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні», кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Алена МАРГУНОВА. — Але ёсць шэраг прадуктаў, якія з'яўляюцца імунамадулятарамі. Прытрымліваючыся пэўных рэкамендацый, можна ўзмацніць ахоўныя функцыі арганізма, а значыць, больш эфектыўна супрацьстаяць інфекцыям.

Крыніца жыцця

Вы здзівіцеся, але найважнейшым прадуктам для ўмацавання імунітэту з'яўляецца... вада. Сакрэт у тым, што вада павінна быць якаснай, а з гэтым у сучаснага чалавека вялікія праблемы.

— Каб стаць імунамадулятарам, пітная вада, здабытая з артэзіянскай свідравіны, пры неабходнасці павінна прайсці шэраг такіх спецыфічных тэхналагічных аперацый, як абезжалезванне, памякчэнне, шматступеньчатая фільтрацыя. Чыстыя, вільготныя слізістыя — гэта першы бар'ер на шляху віруса, — адзначае суразмоўніца. СТАР. 6

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эксперты прагназуюць рост цэн на нафту да $100 за бараль

У найбліжэйшыя гады цэны на нафту паднімуцца вышэй за адзнаку 100 долараў за бараль з-за скарачэння яе здабычы, а таксама зніжэння інвестыцый у галіну, прыводзіць газета The Wall Street Journal меркаванні шэрагу экспертаў. «Ціск недафінансавання будзе вельмі сур'ёзны. Некаторым вытворцам стане рэальна складана працягваць здабычу», — лічыць аналітык хэдж-фонду Northern Trace Capital Трэвар Вудс. Ён упэўнены, што планка ў 150 долараў за бараль можа быць лёгка дасягнута да 2025 года. Яго калегі, чые думкі таксама прыводзіць WSJ, упэўненыя, што вымушанае прыпыненне прадпрыемстваў, а таксама параліч паветраных перавозак у свеце з-за эпідэміі каранавірусной інфекцыі ўжо залажылі тэндэнцыю сусветнага зніжэння выдаткаў на сыравіну.

Урад Харватыі скароціць склад кабінета

Склад новага ўрада, кансультацыі адносна якога цяпер праводзіць Андрэй Пленкавіч, лідар партыі «Харвацкая дэмакратычная супольнасць», якая перамагла на парламенцкіх выбарах 5 ліпеня, будзе паменшаны ў параўнанні з папярэднім кабінетам міністраў. «Частка членаў гэтага ўрада застанецца, а частка пяройдзе ў Сабор (аднапалатны парламент. — **«Зв.»**). Частка новых [міністраў. — **«Зв.»**] далучыцца», — адзначыў у гутарцы з журналістамі Пленкавіч, але не ўдакладніў колькасць будучых міністэрстваў. Як інфармаваў лідар ХДС, новы склад кабінета будзе абвешчаны пасля апублікавання Дзяржаўнай выбарчай камісіяй афіцыйных вынікаў. Як вядома, на выбарах у 151-месцавы парламент Харватыі 10-га склікання пераканаўчую перамогу атрымала ХДС — 66 мандатаў плюс яшчэ 10 месцаў кааліцыйных партнёраў.



У Еўропе вырас попыт на дамы на колах

Надышоў сезон адпачынкаў, і на фоне пандэміі каранавіруса ўсё больш людзей адмаўляюцца ад далёкіх пералётаў і перапоўненых гасцініц. Толькі ў маі жыхары ФРГ набылі звыш 10 тысяч новых трэйлераў — амаль на траціну больш, чым летась. У Іспаніі попыт на кемперы таксама вырас — на 20 працэнтаў. Усяго цяпер у Еўропе каля 5 мільёнаў уладальнікаў жылых аўтафургонаў. Прыкладна 2 мільёны «караванаў» ўжо ў дарозе. «Еўрапейскі рынак развіваецца, ён усё больш арыентаваны на маладых, спартыўных людзей. Таму аўтадамы і карыстаюцца такой папулярнасцю, апошнім часам — і ў краінах Усходняй Еўропы», — адзначыў Фрэнк Вілі, камерцыйны дырэктар кампаніі Benimar, якая ўжо больш за 40 гадоў займаецца вытворчасцю і пастаўкай жылых аўтафургонаў, перадае Euronews. Вырасла цікавасць і да арэнды трэйлераў. Толькі на адной з анлайн-платформаў браніравання Yescapa зарэгістравана адпаведных запытаў на 60 працэнтаў больш, чым летась.

ISSN 1990 - 763X

КОРАТКА

- Паступленне бюджэтнага пакета дакументаў на 2021 год у парламенце чакаюць восенню.
- **Краіны ЕАЭС маюць намер сумесна рэалізаваць касмічны праект.**
- Колькасць насельніцтва гарадоў-спадарожнікаў Мінска павялічваецца.
- **У пункце пропуску «Дамачава» ўсталявалі новае вагавымяральнае абсталяванне.**
- ЮНІСЕФ у Беларусі і БАТЭ стануць партнёрамі па развіцці інклюзіі праз спорт.
- **Чартары ў Туніс адкладзеныя як мінімум да 22 ліпеня.**
- Танцавальны калектыў БДПУ стаў прызёрам фестывалю Global Internet Dance.
- **Бясплатны анлайн-рэсурс па ўсвядомленым бацькоўстве створаны ў Беларусі.**

АСА АТАКУЕ РАПТОЎНА

Як засцерагчыся ад крылатых агрэсараў?

Пры ўсіх выгодах лета ёсць у ім адзін мінус — рэзка актывізуюцца небяспечныя насякомыя. Восы, пчолы, чмялі і шэршні асабліва заўважны ў цёплае надвор'е і ў другой палове лета, калі спее садавіна. Няпрошаныя госці могуць да вас прычапіцца, калі вы варыце варэнне, праветрываеце пакой без маскітнай сеткі альбо проста выйшлі пагуляць у яркім адзенні. Вынік уджалення можа быць вельмі сумны.

Шырока вядомы выпадак у Слуцку, які адбыўся ў верасні 2018 года. Тады восы атакавалі мужа і жонку — яны вылецелі з саломы на прысядзібным участку і напалі на сужэнцаў. Мужчына атрымаў чатыры ўкусы, але пагаршэння стану не адчуў. А вось жанчыне не пашанцавала — раз'юшаныя насякомыя пачалі яе кусаць у вобласці грудзей і жывата. Пры дапамозе дыхлафосу муж разагнаў рой. Жанчына зайшла ў дом і пачала задыхацца. Медыкі выратаваць яе не здолелі...

Тады ж, у 2018-м, восы сумна адзначыліся і ў Гродне, дзе напалі на дзяцей у садку. Тады ў бальніцу трапіла пяцёра малых. Хэпі-эндам скончылася гісторыя ў Мсціслаўскім раёне, дзе мясцовую жыхарку атакавалі шэршні, — яе, на шчасце, удалося выратаваць супрацоўнікам МНС. СТАР. 5